Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

DOI:10.17951/sb.2018.12.83-101
Studia Białorutenistyczne 12/2018 Literaturoznawstwo

Ірына Багдановіч / Iryna Bahdanowicz

Białoruski Uniwersytet Państwowy w Mińsku (Białoruś)
Belarusian State University in Minsk (Belarus)

e-mail: ibogdana@yandex.ru

https://orcid.org/0000-0002-3468-7088

Біблійныя матывы і сімвалы ў польскамоўнай паэзіі Беларусі XIX стагоддзя

Biblical motives and images in the polish-speaking poetry of Belarus in the 19th century

Motywy i symbole biblijne w polskojęzycznej poezji Białorusi XIX wieku

Abstract

This article is devoted to the development of spiritual poetry in Polish-language literature of Belarus in the 19th century. Focus is brought to the interpretation of biblical motifs and images in the works of T. Lada-Zablotsky, Y. Chachot, G.Puzynya and V. Syrokomlya, with reference to the influence of romanticism on these writers. The poem *Iyeremia's cry* by T. Lada-Zablotsky is presented as a literary paraphrase of Psalm 137 (136 in Eastern Christian tradition). Special attention is paid to the series of religious poems by Y. Chachot from the volume *Songs of the Landlord*, never studied before by Belarusian researchers. His works, modelled after the Epistles of Paul, have been received as a poetic interpretation of the Commandments and Christian Virtues, which in turn brought the concept of poetic „catechism" in Y. Chachot's œuvre. The comparison of the Biblical motifs in the works of G. Puzynya and V. Syrokomlya proves the associative closeness of the authors, seeking original metaphors and striving to give new meanings to Christian symbols, such as the bell, the cross, the church, or the cleric. The author comes to the conclusion that the interest in psalms as a genre and the biblical symbolism contained therein increased greatly in romantic literature, especially in poetry. References to biblical motifs allowed the poets to express patriotic feelings, to sacralize them, and to emphasize the ideals of freedom. Religious poetry of the period studied served didactic purposes, taking the form of a certain „secular apostleship". We can therefore speak of poetic Christian pedagogy, whose principles of exegesis and catechesis were based on moral examples drawn from national history.

Keywords: Belarusian literature, biblical motifs, religious poetry, romanticism, Christian symbols

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Abstrakt

W artykule podjęto temat rozwoju poezji religijnej w polskojęzycznej literaturze białoruskiej XIX w. Analizie poddano sposoby interpretacji motywów biblijnych w twórczości Tadeusza Łady-Zabłockiego, Jana Czeczota, Gabrieli Puzyniny, Władysława Syrokomli, uwzględniając przy tym swoiste oddziaływanie romantyzmu na wymienionych twórców. Tekst Łady-Załockiego *Żale Jeremiasza* przedstawiono jako parafrazę psalmu 137 (w tradycji wschodniochrześcijańskiej – 136). Zwrócono uwagę na cykl religijnych wierszy Czeczota z tomu *Pieśni ziemianina*, który dotychczas nie był przedmiotem zainteresowania białoruskich naukowców. Utwory poety wzorowane na listach apostoła Pawła odczytano jako poetycką interpretację przykazań i cnót chrześcijańskich, co pozwoliło sformułować tezę o swoistym „katechizmie" poetyckim Czeczota. Porównanie motywów biblijnych w twórczości Puzyniny i Syrokomli pokazało bliskość asocjacyjną autorów, poszukujących niebanalnych metafor i dążących do nadania nowych znaczeń symbolom chrześcijańskim, takim jak: dzwon, krzyż, kościół, kleryk. Autorka artykułu dochodzi do wniosku, że w literaturze romantycznej, zwłaszcza w poezji, wzrasta zainteresowanie psalmami jako gatunkiem oraz zapisaną w nich symboliką biblijną. Odwołania do motywów biblijnych pomagają poetom wyrażać uczucia patriotyczne, sakralizować je, eksponować ideę wolności. Poezja religijna badanego okresu pełni funkcje dydaktyczne, przybierając postać swoistego „świeckiego apostolstwa". Można zatem mówić o poetyckiej pedagogice chrześcijańskiej, której zasady egzegezy i katechezy oparte są na wzorach zaczerpniętych z historii narodowej.

Słowa kluczowe: literatura białoruska, motywy biblijne, poezja religijna, romantyzm, symbole chrześcijańskie

Анатацыя

Артыкул прысвечаны спецыфіцы развіцця рэлігійнай паэзіі ў польскамоўнай літаратуры Беларусі XIX стагоддзя. Аналізуюцца асаблівасці інтэрпрэтацыі біблійных матываў і вобразаў ў творчасці Тадэвуша Лады-Заблоцкага, Яна Чачота, Габрыэлі Пузыні, Уладзіслава Сыракомлі, адзначаецца, што зварот да іх быў абумоўлены ўплывам рамантызму. Верш Т. Лады-Заблоцкага *Жаль Ераміі* даследуецца як літаратурны парафраз 137 псалма (ва ўсходнехрысціянскай традыцыі – 136). Звяртаецца ўвага на цыкл рэлігійных вершаў Я.Чачота са зборніка *Pieśni Ziemianina*, які не быў дагэтуль прадметам увагі беларускіх даследчыкаў. Творы паэта, узорам для якога былі Пасланні апостала Паўла, разглядаюцца як паэтычная інтэрпрэтацыя біблійных запаведзяў і хрысціянскіх дабрачыннасцяў, што дае падставу гаварыць пра своеасаблівы паэтычны „катэхізіс" Чачота. Параўнанне біблійных матываў у творчасці Г.Пузыні і У.Сыракомлі дазволіла выявіць асацыятыўную блізкасць аўтараў на шляху новай метафарызацыі і пераасэнсавання хрысціянскіх сімвалаў, такіх як: *звон, крыж*, *святар, храм*. Робяцца высновы, што ў літаратуры рамантызму, асабліва ў паэзіі, узрастае цікавасць да паэтыкі псалмоў як жанру і да біблійнай сімволікі. Зварот да біблійных матываў і вобразаў дапамагае паэтам выявіць патрыятычныя матывы, сакралізаваць іх, актуалізаваць ідэалы свабоды і змагання за вызваленне айчыны. Рэлігійная паэзія гэтага часу выконвае дыдактычна-выхаваўчую функцыю, набывае форму своеасаблівага паэтычнага „свецкага апостальства". Таму можна гаварыць пра паэтычную хрысціянскую педагогіку, прынцыпы экзегезы і катэхезы якой грунтуюцца на маральных прыкладах з нацыянальнай гісторыі.

Ключавыя словы: беларуская літаратура, біблійныя матывы і вобразы, рэлігійная паэзія, рамантызм, хрысціянскія сімвалы

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Духоўная паэзія на шляхах свайго развіцця: некалькі ўводных заўваг

У шырокім сэнсе слова духоўнай паэзіяй прынята называць творы на біблійную тэматыку маральна-павучальнага, гімнаграфічнага і малітоўнага зместу, якім і вызначаюцца яе асноўныя жанрава-стылёвыя разнавіднасці. Духоўная паэзія ў Беларусі мае глыбокія карані і прайшла не малы шлях развіцця. Гімны, рэлігійныя песні, малітвы і г.д., уваходзячы або не ўваходзячы ў склад кананічных біблейскіх кніг, суправаджалі цэлебрацыю літургіі ўжо ў раннія часы хрысціянства; яны выяўлялі эмацыйны стан вернікаў, дапамагалі ўвайсці і перажыць стан рэлігійнай узрушанасці, усталяваць свой асабісты духоўны дыялог-кантакт з Богам-Творцам.

Стваральнікамі тэкстаў такога кшталту былі пераважна духоўныя асобы – адукаваныя манахі, вучні духоўных устаноў, брацкіх школ, святары і біскупы, як, напрыклад, усім вядомы Кірыл епіскап Тураўскі ў далёкім XII ст. – першы духоўны пісьменнік Беларусі. Да часу Рэнесансу наогул лічылася, што рэлігійнае хрысціянскае пісьменства – выключны прывілей духавенства, а не свецкіх, паспалітых людзей. Рэнесанс, узняўшы асобу чалавека (але не ставячы яе ўпоравень з Богам і разумеючы іерархію каштоўнасцей), надаў большыя правы свецкім асобам, і адбыўся культурны выбух: Біблія друкуецца не толькі для „напрастольнага" выкарыстання, але для кожнага паспалітага верніка – чалавека свецкіх заняткаў, падарожнікаў, купцоў і г.д. Яна даступная ў дарозе, у хатнім малітоўным ужытку, для прыватнага карыстання, у тым ліку для адукацыйных мэтаў – пры навучанні, паводле беларускага друкара Францыска Скарыны, свецкім навукам.

У святле нядаўняга 500-гадовага юбілею беларускага і ўсходне-славянскага кнігадрукавання варта яшчэ раз нагадаць пра гэта: свецкі чалавек, доктар сямі свабодных і лекарскіх навук, філосаф-тэолаг, пісьменнік і арганізатар друкарскай справы, Францыск Скарына піша прадмовы і пасляслоўі да выдаваных ім ва ўласным беларускім перакладзе біблейскіх кніг, займаючыся фактычна іх экзегетыкай (тлумачэннем), робіць вершаваныя ўстаўкі, пазней стварае ўласныя малітвы і акафісты, перастварае ў сучасным сабе моўным варыянце малітвы Кірыла Тураўскага – і ўсё гэта не толькі і не столькі для царкоўных іерархаў, колькі для адукаванага кола паспалітых суайчыннікаў, людзей самых розных свецкіх заняткаў. Ужо ў самым пачатку першай сваёй прадмовы да *Псалтыра* Скарына вызначае (са спасылкай на апостала Паўла) дваістую скіраванасць Святога Пісьма – на духоўнае ўзрастанне і на карыснасць спажытку ў зямных справах, што адпавядае самой дваістай прыродзе Хрыста як Богачалавека: „Всяко писание Богом водъхненое полезно ест ко учению и ко обличению, исправлению и ко наказанию правды. Да совершен будеть человек Божий и на всяко дело добро уготован – яко святый апостол Павел пишеть" (Skaryna, 1990, s. 17). Гэта прамая цытата з 2-га Паслання апостала Паўла да Цімафея (Tym 3, 16–17), і яна становіцца для Скарыны фактычна кіраўнічым імпульсам – *motto* – усёй яго асветніцка-гуманістычнай дзейнасці.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Такім чынам, Скарына, перакладаючы, тлумачачы і друкуючы кнігі Святога Пісьма, фактычна пераймае справу апостальскага служэння, пашыраючы Біблію як крыніцу хрысціянскай веры, маральнага ўдасканалення і асветы ў розных галінах пазнання. Можна сцвярджаць, што так званае „свецкае апостальства" пачынаецца на нашых землях менавіта з Францыска Скарыны. Працяг такога „свецкага апостальства" ёсць і ў сучаснасці, яскравым прыкладам чаго стала, на нашу думку, паэзія народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, якую, пачынаючы ад яго кнігі *Евангелле ад Мамы* (1995), а потым – *Ксты* (2005), *Рымскі дыпціх* (2006) ды іншыя, можна лічыць (і не толькі метафарычна!) сапраўдным паэтычным апостальствам.

Духоўная паэзія вельмі актыўна пашыралася і развівалася ў часы Барока. Прычым, з гэтага часу яна набывае як элітарны, так і народна-дэмакратычны характар. Беларуская народная духоўная паэзія (як правіла, ананімная) збіралася, сістэматызавалася і вывучалася Паўлам Шэйнам, Яўхімам Карскім, Вацлавам Ластоўскім. Элітарная духоўная паэзія на польскай і старабеларускай мовах стваралася як духоўнымі, так і свецкімі высокаадукаванымі людзьмі, паэтамі, якія ў тым часе ў паўсядзённым сваім жыцці былі глыбокімі вернікамі, выхаванымі ў традыцыі хрысціянскай культуры. Сярод найвядомейшых аўтараў – Сімяон Полацкі ў XVII ст., Францішка Уршуля Радзівіл і Францішак Карпінскі ў XVIII ст., якія стварылі выдатныя ўзоры медытацыйна-малітоўнай, гімнаграфічнай, дыдактычнай, фунеральнай духоўнай паэзіі, што і сёння захапляюць нас глыбінёй рэфлексіі і дасканалым майстэрствам формы.

Асаблівасці духоўнай паэзіі XIX стагоддзя

У XIX ст. духоўная паэзія не спыняе свайго развіцця, нягледзячы на лаіцкі дух толькі што перажытага, але ўсё яшчэ ўплывовага Асветніцтва з яго культам розуму, ідэямі выгады, карысці (у процівагу ахвярнаму служэнню), самадастатковасці чалавека, які для дасягнення жыццёвага поспеху пакладаецца не столькі на Божую моц, колькі на ўласныя сілы ды навуковыя, перадусім прыродазнаўчыя, веды.

Духоўную паэзію абнаўляе Рамантызм з яго скіраванасцю да „ўнутранага зроку" (духоўнага зроку, або „трэцяга вока"), да пазнання праўд жыцця і праўд веры „сэрцам", прычым, не ў значэнні асветніцка-сентыментальнага „чуллівага" сэрца як выніку „цялеснай прыроды", а ў значэнні сэрца „чулага" – ў процівага сэрцу „каменнаму", што значыць духоўна сляпому, нячуламу, якому даступныя толькі вонкавыя праявы знешняга, „бачнага" свету. „Miej serce i patrzaj w serce! / Май сэрца, глядзі ў сэрца!" – такім заклікам, як вядома, закончыў сваю балладу *Рамантычнасць* Адам Міцкевіч (Mickiewicz, 1822–1823, s. 10), і яна стала літаратурным маніфестам новага літаратурнага напрамку на літоўска-беларуска-польскім культурным абшары.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Калі Асветніцтва актуалізавала антычнасць як ўзор дасканаласці і крыніцу натхнення, то ў Рамантызме актуалізуецца цікавасць да Бібліі як крыніцы матываў і вобразаў і пашыраецца зварот да інтэрпрэтацыі біблійных сюжэтаў і герояў, што давала магчымасць стварэння агромністага кола алюзій, асацыяцый, адсылак і рэмінісцэнцый нават у паэзіі абсалютна свецкай па тэматыцы і пафасе. Прыкладам і ўзорам тут паслужылі *Габрэйскія мелодыі* Джона Гордана Байрана, створаныя „па матывах" розных кніг Бібліі. Актуалізуюцца біблійны парафраз і наследаванне, асабліва папулярнымі становяцца парафразы псалмоў, якія будуць таксама вельмі прыдатнымі для паэтычнай рэфлексіі і ў беларускай паэзіі пачатку XX ст. – асабліва ў творчасці Янкі Купалы і Казіміра Сваяка.

Асноўныя матывы псалмоў, якія натхнялі паэтаў-рамантыкаў на парафраз і пошук новых мастацкіх рашэнняў, не столькі ўслаўляльныя, пакаяльныя ці малітоўныя, колькі патрыятычныя, часам нават з выказваннем гневу, або так званага „патрыятычнага адчаю". Перанос думкі і вобразнага поля псалма на сучасную аўтару глебу дапамагала глыбей перадаць свой унутраны эмацыйны стан, пачуцці, а таксама выказаць свой патрыятычны настрой – стан роспачы, гневу, падзякі, спадзявання і г.д., звяртаючыся да адпаведнага біблійнага тэксту і парафразуючы яго паводле новай мастацкай задачы. Звернемся да канкрэтных прыкладаў у корпусе польскамоўнай паэзіі Беларусі XIX ст., якія даволі доўгі час знаходзіліся па-за сферай цікавасці даследчыкаў, хоць належаць пяру вядомых аўтараў – такіх, як Ян Чачот, Тадэвуш Лада-Заблоцкі, Габрыэля Пузыня, Уладзіслаў Сыракомля. Праўда, некаторыя з гэтых твораў так і не з'явіліся ў свой час на старонках друку.

Верш Тадэвуша Лады-Заблоцкага *Жаль Ераміі*

Цікавасць для нас у плане распачатай гаворкі ўяўляе творчасць Тадэвуша Лады-Заблоцкага (1811–1847). Працуючы перыядычна ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы ў Вільнюсе, сярод рукапісаў XIX стагоддзя мы напаткалі падборку вершаў Т. Лады-Заблоцкага, куды ўваходзілі 23 вершы і прызначаліся яны для друку ў тагачасным віленскім часопісе „Athenaeum", які рэдагаваў Юзаф Ігнацы Крашэўскі. Вершы былі сапраўды надрукаваныя ў гэтым выданні ў 1844 г. (т. 3), за выключэннем аднаго твора, тэкст якога ў рукапісе быў тлуста закрэслены чырвоным алоўкам цэнзара. Закрэслены верш называўся *Żal Jeremijusza (Naśladowanie psalmu 136*[1]*)* – (*Жаль Ераміі (Наследаванне 136*

[1] Па ўсёй верагоднасці, Т. Лада-Заблоцкі быў уніятам, бо ён вучыўся ў Віцебскай гімназіі базыльянаў (*Marchel*, 1997, s. 80), а значыць выхоўваўся на біблійных тэкстах, прынятых у базыльянскім, або грэка-каталіцкім, асяроддзі. Усходне-хрысціянская традыцыя (уніяты і праваслаўная), а таксама пратэстанты абапіралася на грэцкі пераклад Бібліі – на Септуагінту, у якой выкарыстоўваецца іншая нумарацыя псалмоў, чым яна захоўвалася ў даўняй габрэйскай традыцыі і ў лацінскім перакладзе Бібліі – Вульгаце, што легла

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

псалма)). У наступным, 1845 г., у Пецярбургу быў выдадзены Рамуальдам Падбярэскім ладны том паэзіі Т. Лады-Заблоцкага (Łada-Zabłocki, 1845), куды таксама ўвайшлі ўсе вышэйзгаданыя вершы, за выключэннем закрэсленага цэнзурай *Жалю Ерамії*. У беларускім літаратуразнаўчым дыскурсе гэты верш Т. Лады-Заблоцкага ніколі не быў аб'ектам увагі даследчыкаў, застаючыся невядомым.

Чым жа не задаволіў гэты верш у свой час цэнзара? Змест самога 136-га псалма даволі „жорсткі": у старазапаветным духу „вока за вока…" тут гучыць матыў помсты за знявагу, разбурэнне і зло, прычыненае заваёўнікамі паняволенаму народу і яго гораду. Ідэя псалма ўспрымалася паэтам XIX ст. як актуальная, яна выклікала асацыяцыі з паняволеным становішчам роднага краю. Нагадаем змест біблейскага псалма 136-га (*Псалом Давіда. Ярэмы*):

1) Над рэкамі Бабілёну, там сядзелі мы і плакалі, калі ўспаміналі Сыён.
2) На вербах пасярод яго павесілі мы гусьлі свае;
3) бо там тыя, што нас паланілі, пыталі нас пра словы песьняў, а тыя, што нас вялі – пра гімн: „Засьпявайце нам з песьняў Сыёнскіх".
4) Як нам сьпяваць песьню Гасподнюю на чужой зямлі?
5) Калі забуду цябе, Ерусалім, хай будзе забытая правіца мая!
6) Хай язык мой прысохне да паднябеньня майго, калі ня буду памятаць пра цябе, калі не пастаўлю Ерусалім на пачатку радасьці маёй.
7) Прыгадай, Госпадзе, дзень Ерусаліму сынам Эдомскім, якія казалі: „Спусташайце, спусташайце яго да асноваў!"
8) Дачка бабілёнская, паганая! Блаславёны той, хто адплаціць табе за тое, што ты ўчыніла нам.
9) Блаславёны той, хто возьме і разаб'е аб камень дзетак тваіх
(*Psałtyr*, 2016, s. 244–245).

Трэба заўважыць, што гэты псалом стаў таксама адным з тэкстаў, якому наследаваў у *Габрэйскіх мелодыях* Д.Г. Байран. Па матывах 1–6 вершаў гэтага псалма Байран стварыў прынамсі два асобныя вершы-варыянты ў згаданым цыкле: *By the rivers of Babylon we sat down and wept* і *By the waters of Babylon* (Byron, 1979, s. 179–181). У абодвух творах Байран апускае „жорсткую" частку, дзе гучыць заклік да помсты ворагу, і абмяжоўваецца толькі матывам палону, акцэнтам на тым, што арфы вісяць у маўчанні на вербах, што нікога нельга прымусіць спяваць у няволі. На рускай мове першы варыянт верша Байрана вядомы ў таленавітым перакладзе Аляксея Пляшчэева *У вод вавилонских, печалью томимы…*, зробленым у 1813 г. Існуе таксама вольны пераклад Дзмітрыя Міна *Ах, плачьте,*

ў аснову рыма-каталіцкай традыцыі заходняга хрысціянства. Таму нумарацыя псалма 136 – у рукапісе Т. Лады-Заблоцкага і 137 – у яго апублікаваным у польскім друку варыянце паказваюць менавіта гэтую розніцу біблійных традыцый і ідэнтыфікуюць самога паэта як прыналежнага да ўсходняй, грэка-каталіцкай (уніяцкай) царквы.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

как плакали мы на реках вавилонских, які па форме бліжэй суадносіцца з другім вершаваным варыянтам Байрана (Bajron, 2012, s. 160, 182).

Верш Т. Лады-Заблоцкага ніякім чынам нельга назваць перакладам з *Габрэйскіх мелодый* Байрана, гэта цалкам самастойны твор, хаця не выключана, што менавіта байранаўскі цыкл мог падштурхнуць да біблійных інтэрпрэтацый, бо ён даваў прыклад і ўзор для тагачасных паэтаў. Лада-Заблоцкі ведаў і любіў творчасць Байрана, выкарыстоўваў яго радкі ў якасьці эпіграфаў для сваіх твораў.

Аднак, зварот Лады-Заблоцкага да 136-га псалма быў звязаны, на нашу думку, не столькі з уплывам Байрана, колькі з патрыятычнымі настроямі самога паэта, які знаходзіў у біблійным тэксце сугучнасць сваёй трывозе і роспачы. Змест псалма непасрэдна звязваўся паэтам з рэчаіснасцю, пры дапамозе біблійнага тэксту можна было перадаць усю пякельную пакуту няволі, у якую трапіў родны край, параўноўваючы яго з захопленым Ерусалімам. Сам Лада-Заблоцкі назваў свой верш *Жаль Ерамії* наследаваннем 136-га псалма, і верш, сапраўды, вельмі блізкі да арыгіналу, поўнасцю захоўвае яго структуру і аб'ём. Пафас верша, як і самога псалма, патрыятычны, а дакладней ён выражае стан „патрыятычнага адчаю". Пад вобразам „вавілонскай дачкі" выразна праглядаюцца ў вершы Лады-Заблоцкага абрысы Расійскай імперыі, якая панавала на землях былой Рэчы Паспалітай ужо некалькі дзесяцігоддзяў. Верш Лады-Заблоцкага, як ужо было сказана, захоўвае ўсе зместава-структурныя часткі псалма і мае, адпаведна, дзевяць строфаў, у якіх паслядоўна развіваюцца матывы жалю і прагі справядлівасці. Аўтар поўнасцю наследуе біблейскі тэкст, захоўваючы таксама і матыў помсты ў тых вобразных формах, як гэта было пададзена ў арыгінале – уключна з „разбіваннем галоў немаўлятам", што сімвалізавала помсту ворагам і ўзнаўленне справядлівасці, паводле прынцыпаў Старога Запавету.

Прывядзем тэкст арыгінальнага верша Т. Лады-Заблоцкага паводле архіўнага рукапісу:

Żal Jeremijusza (Naśladowanie psalma sto trzydziestego szóstego)

Kiedy gniew pański dotknął nasze plemie,
Myśmy tułacze, bez żadnej opieki,
Siedząc na brzegu babilonskiej rzeki
Płakali świętą wspominając ziemię.
I harfy nasze co w pieniach stokrotnych,
Wielbiły Twórcy rąk dzieła cudowne,
W głuchem milczeniu, jak skały bezmówne
Wisiały smutnie na wierzbach samotnych.
Wtenczas synowie dumni Babilonu,
Wołali na nas: rozjaśnijcie czoła,
Przestańcie płakać, – i niech pieśń Syonu
Zabrzmi jak przed tem na harfach wesoła.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Czyliż nie wiecie sprawcy naszej doli,
Że pieśń Syonu jest pieśnią swobody;
Jakże ją śpiewać śród obcej zagrody,
Na obcej ziemi i w jarzmie niewoli.
Jeruzalemo! Tyś dzisiaj w żałobie,
Twych wiernych synów nieprzyjaciel nęka,
O! Jeśli kiedy zapomnę o tobie
Niech wprzódy uschnie prawa moja ręka.
Jeślibym ojców zrzekłszy się zakonu
Nad twoje szczyty, o święty Syonie!
Przeniósł niekształtne baszty Babilonu,
Niech krew zastygnie w podlem zdrajcy łonie.
Panie! Przypomnij potomkom Edomu,
Jeruzalemy ostatnie zniszczenie,
Kiedy biegając od domu do domu
Na święte gmachy rzucali płomienie!
Biada ci, biada! Babilońska córo!
Coś krwią zbroczyła grobowce mych braci,
Stokroć szczęśliwy, kto zemstą ponurą
Za twoje zbrodnie dostojnie odpłaci.
Stokroć szczęśliwy ten wyrodek wściekły,
Co ciebie wstydem i hańbą okryje,
Co krwią twych ojców i braci ociekły
Twe niemowlęta o kamień rozbije
(AR BLAN, F9-2148, k. 11).

У рукапісе верш не мае пазначэння даты і месца напісання, але ён запісаны паміж іншымі вершамі, якія маюць дакладную пазнаку „1835. Witebsk", таму з усёй верагоднасцю можна лічыць, што і *Жаль Ераміі* быў напісаны ў 1835 г. у Віцебску.

Такім чынам, як можна заўважыць, верш вельмі блізка ўзнаўляе тэкст 136 псалма, насычае яго экспрэсіяй і ўзмацняе акцэнты, сугучныя часу, калі ён быў напісаны. Як ужо адзначалася, верш быў забаронены цэнзурай, у ім вельмі выразна гучаў патрыятычны матыў і заклік да змагання з ворагам-захопнікам. Аднак, нягледзячы на гэта, верш усё ж трапіў на старонкі друку. Ён быў апублікаваны ў часопісе *Rubon* у 1846 г. сярод іншых вершаў паэта, якія, паводле загалоўка публікацыі, да таго часу нідзе не друкаваліся (Łada-Zabłocki, 1846, s. 160–162). У параўнанні з рукапісам, у друкаваным тэксце ёсць розначытанні, якія, хутчэй за ўсё, былі зробленыя пры рэдагаванні і падрыхтоўцы да друку, бо сам паэт у гэты час знаходзіўся далёка ад роднага краю – у паўднёвай ссылцы на Каўказе, куды ён быў адпраўлены на вайсковую службу, а падрыхтоўкай да друку ягоных твораў займаліся іншыя асобы. Так, нумар псалма, якому наследаваў

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Т. Лада-Заблоцкі, быў пададзены паводле рыма-каталіцкай, заходняй традыцыі (137, а не 136 як было ў аўтара); у публікацыі пад тэкстам верша была дакладная пазнака даты і месца напісання: 1835. Witebsk; а таксама некаторыя змены адбыліся у лексічна-вобразным складзе твора (напрыклад: *Okryte pyłem…* замест *W głuchem milczeniu…*; *Śród obcych ludzi…* замест *Na obcej ziemi…,* ды іншыя).

Факт публікацыі раней забароненага верша дазваляе зрабіць прынамсі дзве высновы. Па-першае, відавочна, што іншы цэнзар, прапускаючы раней забароненыя верш да друку (відавочна, гэта быў іншы спіс твора ў іншым камплекце прызначаных для друку вершаў), не ўгледзеў у ім патрыятычнай алегорыі і ўспрыняў яго як верш чыста рэлігійнага зместу. Па-другое, Т. Лада-Заблоцкі на час напісання *Жалю Ераміі* зазнаў ужо пераслед расійскіх уладаў за напісанне верша антыцарскага зместу і смелыя, варожыя да царызму, выказванні ў лістах. За гэта, як вядома, ён быў у 1833 г. выключаны з ліку студэнтаў Маскоўскага ўніверсітэту, трапіў пад следства і быў прыцягнуты да судовай адказнасці, але па невядомай прычыне выпушчаны да суда на волю (Khaustovich, 2010, s. 245–246). Так што, напярэдадні адпраўкі на Каўказ, 1835 год у Віцебску быў для паэта, сапраўды, плённым у творчым плане. Ён выкарыстаў форму наследавання 136 (137) псалма, менавіта каб зашыфраваць свае гарачыя пачуцці, свой ідэал свабоды і выражэнне „патрыятычнага гневу" праз вядомы шырокаму колу біблійны тэкст, дзе такія пачуцці і ідэалы як раз прысутнічалі.

Паэтычная „катэхеза" Яна Чачота

Вяртаючыся да тэмы „свецкага апостальства", звернем увагу на тое, што крыніцай натхнення для паэтаў часта станавіліся, апрача псалмоў, таксама апостальскія пасланні, асабліва пасланні апостала Паўла. Сярод паэтаў XIX ст. у гэтым плане вылучаецца Ян Чачот (1796–1847). У беларускім літаратуразнаўчым дыскурсе постаць Я. Чачота асэнсавана няпоўна, прынамсі, губляецца хрысціянска-асветніцкі складнік яго творчасці, шырока прадстаўлены ў яго вяршынным паэтычным зборніку *Pieśni ziemianina* (Wilno, 1846), які на фоне некалькіх выпускаў *Piosenek wieśniaczych znad Niemna i Dźwiny* і іншых (Wilno, 1837, 1839, 1840, 1844, 1845, 1846) зусім выпаў з поля зроку даследчыкаў. Намі былі перакладзены на беларускую мову вершы з гэтага зборніка і ўпершыню апублікаваны (15 вершаў), разам з уступным артыкулам, у часопісе *Наша вера* (Bahdanowicz, 2014, s. 24–26; Czaczot, 2014, s. 27–29).

У вершах гэтага зборніка Я.Чачота знаходзім шмат алюзій на евангельскія і іншыя новазапаветныя тэксты. Наватарства гэтай духоўнай паэзіі ў тым, што Чачот у межах „свецкага вершапісання" стварае сваю спецыфічную рэлігійна-маральную педагогіку, праводзячы своеасаблівую „паэтычную катэхезу" – навучанне асновам хрысціянскай веры і паводзінаў у адпаведнасці з Боскімі прыказаннямі. У паэтычных рэфлексіях на біблійныя тэмы, а таксама прыво-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

дзячы яскравыя і павучальныя прыклады з жыцця розных знакамітых асоб, сярод якіх шмат асоб каралеўскага паходжання, Чачот тлумачыў евангельскія цноты, прыказанні і наступствы грахоў. Вершы Чачота, сярод якіх нямала напісаных у санетнай форме, можна назваць выдатнымі мастацкімі ілюстрацыямі да асноў і пачаткаў хрысціянскай навукі, пра выхаванне якіх у суайчыннікаў дбаў і думаў колішні філамат напрыканцы свайго самотнага жыцця, напоўненага служэннем любові – да Бога, да Айчыны і да бліжняга.

Ужо самі назвы вершаў гавораць пра пэўную хрысціянскую цноту ці дабрачыннасць, якую паэтызуе Чачот: *Сціпласць меркавання пра самога сябе, Людскасць, Святая пакора, Цярплівасць* ды іншыя. Так, у першым вершы ён засцерагае супраць такіх распаўсюджаных грахоў, як пыха і асуджэнне бліжняга, якія чалавек часта ў сабе нават не заўважае. У гэтым творы паэт выкарыстоўвае і прамыя цытаты з Евангелляў: „Кіньце ў яе, хто бязгрэшны, камень"; „Я не ахвяр – міласэрнасці прагну". У вершы *Людскасць* паэт робіць адсылку да *Дзеяў Апосталаў* (10, 25–26), каб падкрэсліць „людскасць" апостала Пятра – першага святара, які акцэнтуе сваю блізкасць да чалавека, разумеючы, што святар „з народу ўзяты і да народу пасланы" (*Дзеі Апосталаў*, 26, 17): „Устань, і я чалавек!" – Апостал Пётр сказаў, / Калі Карнэлій-сотнік да яго ног упаў..." (Czaczot, 2014, s. 27). Чачот прыводзіць таксама ў вершах прыклады святасці і непарушнасці шлюбнай вернасці (*Кацярына Ягелонка, дачка Жыгімонта I*), няхцівасці, дбання пра бедных (*Кацярына з Сабескіх, княгіня Радзівіл*, *Кубачак Сіротка*, *Кацялок*), выхоўвае цноту стрыманасці ў ежы ды піцці, прычым робіць гэта без павучальнай рыторыкі, а нават з гумарам (*Убогі багацей*, *Бедны чалавечак*).

Каларытную гісторыю расплаты за грахі хлусні, пустой кляцьбы і падступнага забойства распавядае паэт у санеце *Попель I і Попель II Хростак*. Верш складаецца з трох сюжэтна-кампазіцыйных частак: экспазіцыі, дзе называецца грэх і небяспека кары для чалавека, якую ён выклікае; уласна павучальнай гісторыі, якая разгортваецца на прыкладзе з жыцця Попеляў – бацькі і сына, якія свядома і бязбожна грашылі, чынячы зло людзям і зневажаючы Бога, але ўрэшце сын панёс адпаведную кару за свае і бацькавы злачынствы; і заключэння-высновы, дзе зноў гучыць голас самога аўтара, які раіць задумацца над наступствамі такога, здавалася б „бяскрыўднага" граху, як пустаслоўная кляцьба. Працытуем гэты высокамастацкі ўзор паэтычнай хрысціянскай „педагогікі" ў нашым перакладзе на беларускую мову:

Попель I і Попель II Хростак

Не кляні, васпан, чарцямі ні сябе, ні брата,
Бо пракляцце небяспечна – прыкладаў багата.
Гэтак Попель Стары кляўся, як схлусіць увішна:
„А няхай, калі няпраўда, з'ядуць мяне мышы!"
Хоць яго яны не з'елі, дый загрызлі сына.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Пэўна, злое выхаванне гэтаму прычына.
Так, аднойчы Попель Хростак, малады, бяспутны,
Паканаў дзядзькоў уласных дзіка і акрутна.
Запрасіўшы тых у госці, загадаў ён слугам
Іх у возеры ўтапіці… Аж аднекуль цугам
Пхнецца войска незлічона – армія мышына!
Наляцела, з'ела жонку і самога сына.
Дык калі з кляцьбы мышамі на'т жыццё змадзее,
Што ж казаць тады пра д'яблаў, пане-дабрадзею!?
(Czaczot, 2014, s. 28).

Выдатнай паэтычнай ілюстрацыяй і красамоўнай экзегезай-інтэрпрэтацыяй ключавых ідэй апостальскіх пасланняў можа служыць верш *Цярплівасць (Думка з казання ксяндза Скаргі на 3-ю нядзелю па Вялікадні)*:

Як пабіліся два хлопцы, бацька ўзяў аднога,
Яго рэмнем адхвастаўшы, кажа да другога:
Ты не сын мне, больш нічога да цябе не маю!
Так зракаецца і Бог нас, калі не карае.
Гаспадар пра дрэва ў лесе дужа не пячэцца,
Хай расце сабе, ён потым спаліць яго ў печцы.
Але ў садзе дрэва песціць, росціць, даглядае;
Так і Бог, каго палюбіць, да сябе схіляе.
Калі лекар пэўна бачыць: хворы памірае,
Піць і есці, колькі хоча, яму дазваляе.
Калі ж бачыць: ачуняе, – голадам прыморыць,
Нават як не ўпадабае гэткіх лекаў хворы.
Калі Бог каго палюбіць, – дбае пра збаўленне:
Спашле кары, абмяжуе і піццё-ядзенне.
Дык з цярплівасцю прымайма болесць, недаедак,
Верачы, што Бог нас мае за ўлюбёных дзетак
(Czaczot, 2014, s. 27).

У гэтым вершы, як бачна, паэт разважае над парадаксальнымі і нават непрымальнымі з пункту гледжання звычайнай чалавечай свядомасці словамі апостала Паўла з *Паслання да Габрэяў*, дзе апостал, у сваю чаргу, выкарыстаў думку з *Прыпавесцяў*: „Бо Госпад, каго любіць, таго карае ды б'е ўсякага сына, якога прыймае (Prz 3, 11-12). Калі вы церпіце кару, дык Бог адносіцца да вас, як да сыноў: бо ці ёсць гэткі сын, якога б не караў бацька?" (Hbr 12, 6–7).

У іншых вершах Чачот „настаўляе" ў такіх цнотах, як уменне дзяліцца з бліжнім сваім набыткам, служыць бліжняму бескарысліва і з любоўю, успамагаць тых, хто ў нястачах і патрэбах, асабліва спагадаць сіротам, быць добразычлівым

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

у адносінах да сялян, дбаць пра іх дабрабыт і духоўнае ўзрастанне, не марнаваць час у пустых яго баўленнях, а рабіць усякую карысную справу. Так, напрыклад, у вершы *Нясвіжскі траўнік* паэт супрацьпастаўляе легкадумную паненку, якая толькі зрывае кветкі ды кідае іх або імі „збаламуціць галаву хлапчыне", і Ганну Ягелонку, якая мэтанакіравана збірала кветкі і зёлкі дзеля вывучэння іх лекавых магчымасцяў і складала свой *Траўнік* для далейшага яго выкарыстання ў медыцыне. Як і ў іншых вершах, Чачот пазбягае нуднага і штучнага маралізатарства, а, як добры і вопытны настаўнік, падводзіць да слушнай высновы. Верш заканчваецца добразычлівым заклікам да „любых паненак" наследаваць годны прыклад Ганны Ягелонкі:

…Дык батаніку вучыце, любыя паненкі,
І свой Траўнічак складайце, хоць бы і маленькі.
Пазнавайце тайны зёлак, хворага лячыце
І з прыгожай дапамогай да людзей ідзіце.
Калі ж хлопец праз вас мае хвораньку галоўку,
Наслядуйце вы і ў гэтым Ганну Ягелонку!
(Bahdanowicz, 2016, s. 31).

Такім чынам, прыведзеныя прыклады вершаў Я. Чачота са зборніка *Pieśni ziemianina* (Wilno, 1846) красамоўна сведчаць пра тое, што духоўна-рэлігійная хрысціянская тэматыка займала ў яго творчасці важнае месца, а напрыканцы творчага шляху, на нашу думку, яна была вызначальнай. Творчасць Чачота гэтага перыяду, можна сказаць, рэалізуе ідэю свецкага „паэтычнага апостальства" праз замацаванне ў паэтычнай вобразнай форме біблійных алюзій, асацыяцый, рэфлексій і ўзнаўляючы хрысціянскі ідэал чалавека, свабоднага ў сваім кіраванні прынцыпамі хрысціянскай педагогікі.

Перазовы паэтычных званоў: Лірнік Вясковы і Аўтарка ў Імя Божае

Сярод паэтаў сярэдзіны XIX ст. глыбокай духоўнай скіраванасцю вылучаецца таксама творчасць двух блізкіх па светаадчуванні аўтараў, якія пакінулі сведчанні сваёй прыязнасці і паэтычных перазоваў вершаванымі радкамі, – Габрыэлі Пузыні (1815–1869) і Уладзіслава Сыракомлі (1823–1862). Яднала гэтых пісьменнікаў нашага краю не толькі шчырая „літвінскасць", глыбокае пачуццё патрыятызму, дэмакратычныя погляды, асабістыя стасункі, але і выразная арыентаванасць на хрысціянскія каштоўнасці. Напрыклад, абодва напісалі прыгожыя марыйныя вершы – гімны ў гонар славутага віленскага абраза Маці Божай Вастрабрамскай. Менавіта на верш Г. Пузыні рэлігійнага маральна-дыдактычнага зместу *Званы для глухіх* Сыракомля адгукнуўся аднайменным вершам

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

з безыменным прысвячэннем „Да…”, змешчаным у яго паэтычнай кнізе *Poezje ostatniej godziny* (Warszawa, 1862). У сваім вершы вясковы лірнік назваў адрасатку „kapłanką naszej ziemi” („святаркай нашай зямлі”), падкрэсліваючы тым самым унікальнасць яе літаратурнага таленту, яе „паэтычнае апостальства”.

Верш *Званы для глухіх* Г. Пузыні, надрукаваны ў літаратурным дадатку да пецярбургскага часопіса „Słowo” (1859, z. 1) быў як бы паэтычным адказам на евангельскі заклік Хрыста да апосталаў ісці і навяртаць людзей, несці „добрую вестку” аб Збаўленні: „Ідзіце і абвяшчайце Евангелле” – гаварыў Збаўца, пасылаючы апосталаў у свет. Свет жа, заняты сваімі зямнымі справамі і клопатамі, быў глухім і сляпым, не бачыў святла і не чуў званоў сумлення. Таму апостальская місія не была лёгкай. Але, запаленыя Хрыстом, яны ішлі ў тыя землі, куды іх пасылаў Настаўнік, клікаць да пакаяння і навяртання, перарабляць закамянелыя сэрцы на сэрцы чулыя, адкрытыя Хрысту і Ягоным запаведзям любові. Габрыэля Пузыня, а дакладней, яе лірычная гераіня, сцвярджае ў сваім вершы менавіта гэтыя маральна-хрысціянскія асновы быцця чалавека, усклаўшы на сябе ў пэўным сэнсе апостальскую прарочую місію. Аднак людзі, бесклапотныя ці заклапочаныя выключна ўласным дабрабытам, глухія і сляпыя, яны не чуюць голасу звона, не бачаць уласных грахоў. Назіраючы тое, Бог пасылае на зямлю ў кожным пакаленні новых прарокаў, не каб пакараць, але каб выправіць людзей, зноў і зноў заклікаць іх да пакаяння і навяртання. Такая ідэя верша Г. Пузыні, і менавіта такім пасланцом „капеланам” называе Ўладзіслаў Сыракомля аўтарку гэтага верша, сваю добрую зямлячку і таварышку па пяры.

Трэба зазначыць, што, магчыма, штуршком для напісання верша Г. Пузыняй стаў у сваю чаргу санет У. Сыракомлі *Na echo dzwonu* (1847), напісаны ў Залуччы:

Co to za gwar poważny? Boże! co ja słyszę?
Dzwonią stąd o dwie mile na Zdrowaś Maryja,
Echo święconej śpiży w chmurach się kołysze
I wilgotne wieczorne powietrze rozbija.
[...]
Boże! któryś poświęcił i dał rozgłos chyży
Echom twardych metali żelaza i śpiży,
Poświęć mojego ducha i piosnkę, mej duszy!

A dozwól, niech brzemienna tony święconiemi,
Rozpłynie jak huk dzwonu po szerokiej ziemi
I serca moich bliźnich ku cnocie poruszy!
(Syrokomla, 1974, s. 30).

Гэты ж матыў абуджаных звонам і пакліканых да хрысціянскіх цнотаў „сэрцаў бліжніх” будзе развіваць вельмі падрабязна, са шматлікімі адсылкамі да

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

біблійных крыніц, Г. Пузыня ў сваім вершы *Званы для глухіх*, пра што ўжо пісалася вышэй.

Перазовы паэтычных галасоў Пузыні і Сыракомлі адчуваюцца і ў іншых вершах абодвух аўтараў. Напрыклад, можна адчуць калі не прамую пераклічку, то блізкасць вобразных палітраў у вершах *Крыж у лесе* Г. Пузыні і *Сасна* У. Сыракомлі. Верш Габрыэлі быў напісаны, паводле даты, 16 мая 1844 г. у Дабраўлянах. Тут адмыслова разгортваецца сімволіка крыжа як знаку святарства. На пачатку верша паэтка адразу ж малюе відарыс новага крыжа, які стаіць пры дарозе на ўзлеску сярод маладых зялёных сасонак:

> W lesie przy drodze stoi krzyż nowy,
> A wkoło jego sosny zielone.
> Widząc krzyż, czy wam przyjdzie do głowy,
> Że był niedawno sosną, jak one? [...]
> (Puzynina, 1845, s. 115).

Далей аўтарка з глыбокім узрушэннем апісвае вясновую радасць маладых сасонак, якія нібыта шкадуюць свайго новага суседа, што быў нядаўна таксама жывым дрэвам з зялёнымі галінамі. Але цяпер яно страціла гэтыя галіны, памерла для свету, але – „у неба ўзносіць рамёна" і становіцца сімвалам вечнасці: „I dźwiga Tego, który go stworzył! / Znak Zbawiciela na sobie niesie" (Puzynina, 1845, s. 116).

У наступных строфах аўтарка развівае сімволіку крыжа, раскрывае яго таямніцы і функцыі, актуальныя для хрысціянскай свядомасці чалавека і яго ўзрастання ў духоўнасці: крыж паказвае дарогу (у рэальным сэнсе, як кірунак у прасторы, і ў містычным сэнсе, як сімвал Хрыста, які ёсць Дарогай, Праўдай і Жыццём), перад ім кленчаць, адпачываюць, моляцца, складаюць ахвяры. Урэшце, крыж, піша аўтарка, ёсць увасабленнем трох Боскіх цнотаў: „Ach! to jest *miłość* razem z *nadzieją*, / Co wieńczą trzecią swą siostrę – *Wiarę*!" (Puzynina, 1845, s. 115).

Крыж не баіцца буры, якая ломіць і хіліць галіны жывых сосен, а знак Веры стаіць непарушна, як сама Вера! Разважаючы ў такім ключы, лірычная гераіня ізноў нібыта пытаецца ў „бедных сосен", ці шкада ім усё яшчэ таго „мёртвага" крыжа? І наводзіць на думку, што гэта ім, жывым соснам, трэба шкадаваць сябе, бо іх ссячэ некалі сякера, і нават калі яны пойдуць на добрую справу, напрыклад, стануць страхою дома або мачтаю карабля, іх усё роўна можа напаткаць сумны лёс: „Dom spłonie, burza maszt pogruchota...". А крыж стаіць і дае надзейную апеку. Заканчвае верш аўтарка адмысловым метафарычным параўнаннем: „Światowi ludzie! Wyście to sosny, / Krzyżem jest dobry kapłan śród ludzi" (Puzynina, 1845, s. 117).

Такім чынам, паэтычная і духоўная глыбіня гэтага верша заключаецца яшчэ і ў вобразнай інтэрпрэтацыі біблійнага сведчання аб святарстве: святар з люду ўзяты і для люду пастаўлены. Вобразы сосен і крыжа, створаныя ў гэтым вершы, з пранікнёнай мастацкай дакладнасцю ўвасабляюць менавіта евангельскую ідэю святарства. Так прачытваецца духоўны сэнс верша *Крыж у лесе* Габрыэлі Пузыні.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Некаторую асацыятыўную сугучнасць мае з гэтым творам і верш-абразок *Sosna* (*Сасна*) У. Сыракомлі, напісаны ў 1857 г. у Вільні, хаця гэта хутчэй сугучнасць, заснаваная на кантрасце: „Na wioskowych mogiłach / Rosła sosna borowa..." (Syrokomla, 1974, s. 54).

Далей паэт, праз мастацкі дыялог сасны з ветрам, распавядае гісторыю гэтай „sosny borowej", якая таксама шумела калісьці жывымі свежымі галінамі і мела моцныя ствол і карэнні. Аднак лёс яе склаўся жахліва, бо яна ўрасла карэннем у магілу злога чалавека і, атруціўшыся ўсім тым злом, якія захоўвалі нават ягоныя парэшткі, урэшце засохла. Бачна, што Сыракомля зусім па-іншаму развівае матыў лёсу сасны, аднак робіць гэта таксама ў духоўным (хрысціянскім) рэчышчы, паказваючы згубнасць грахоў чалавека, таго бязмернага зла, якое знішчае само жыццё і красу – гэтыя Богам дадзеныя велічныя і дасканалыя дары, дзеля якіх быў створаны свет і чалавек.

Яшчэ на адным мала вядомым дасюль вершы Г. Пузыні хочам спыніць увагу – *Касцёл у Бялынічах,* які быў напісаным з нагоды пажару, што адбыўся ў гэтым касцёле ў жніўні 1859 г. Паведамленне пра пажар з'явілася ў тагачаснай віленскай афіцыйнай газеце *Kuryer Wileński* у № 75 за 25 верасня 1859 г. Аўтар яго, Эдвард Жалігоўскі, паведамляў, што праязджаў нядаўна па Беларусі і бачыў вынікі жахлівага пажару ў Бялынічах: шматлікіх пагарэльцаў, рэшткі спаленых будынкаў, выгарэлы ўнутры мураваны касцёл. Мясцовым пробашчам вёўся збор сродкаў для дапамогі пагарэльцам і адбудовы святыні. Бялынічы, пісаў аўтар, былі тады для Беларусі і суседніх з ёй губерній тым жа, чым Чанстахова для Польшчы і Вострая Брама для Літвы (Żeligowski, 1859, s. 3). Напрошваецца вельмі празрыстая аналогія: як у 1850 г. пажар не пакінуў Пузыню раўнадушнай і яна напісала, паводле нашай атрыбуцыі, верш *Кракаў*, так і цяпер, даведаўшыся пра бяду, якая напаткала касцёл і людзей ў Бялынічах, паэтка адгукаецца прыгожым узнёслым вершам, прысвечаным гэтай велічнай, пацярпелай і досыць хутка тады ж адбудаванай, святыні. Верш быў напісаны, што называецца „па гарачых слядах" – 16 студзеня 1860 г. у Гарадзілаве і ўжо 29 студзеня 1860 г. апублікаваны ў той жа газеце „Kuryer Wileński". Твор складаецца з 4-х частак, якія тэматычна развіваюць падзейную канву і ставяць новыя акцэнты. Кампазіцыйную цэласнасць твору і адначасова эмацыйную выразнасць і ўзнёсласць надаюць анафары-пытанні, а адказы на іх разгортваюць і канкрэтызуюць адпаведны вобразны малюнак. Асноўная думка, якая вынікае з твора: святыня – гэта найперш не каменне, а людскія сэрцы, дзе жывуць вера і Бог. Тады і каменныя будынкі – храмы – хутка паўстаюць і аднаўляюцца дзеля хвалы Божай. У якасці прыкладу можна прывесці першую частку гэтага твора, які красамоўна сведчыць, наколькі Беларусь і беларускія рэаліі былі блізкімі Г. Пузыні (цытуецца ў нашым перакладзе на беларускую мову):

Што ж там бялее на фоне нябёсаў,
Што ззяе ў золаце сонечных косаў?

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Куды вядзе той гасцінец-дарога?
– То да святыні, услаўленай цудам,
Ўзнесенай некалі з вераю людам
На чэсць Марыі – на хвалу Бога!
– Краю крыніца адна з найчысцейшых,
Брама да раю адна з найбліжэйшых,
Ласкаў скарбніца,
Долі слязніца,
Крыло, „пад якое ўцякаем", таксама
Сястра Жыровіцаў, Вострае Брамы,
Яснай Гары, што над імі святліцца, –
То адзін з тронаў, працаю люду
Ўзнесены Пані Нябёс, – на зямліцы,
Дзе бачна веліч Божага цуду,
І не адужаць гэтай хвалы нічым –
Гэта Марыі трон, гэта – Бялынічы!
(Puzynia, 2017, s. 44).

Трэба зазначыць, што лёс бялыніцкага касцёла склаўся ў далейшым трагічна: ацалелы ў стыхіі пажару, у перыпетыях канфесійнай прыналежнасці, у ваенных ліхалеццях XX ст., ён быў узарваны ў „мірныя" 1960-я гады пад час чарговай хвалі барацьбы атэістычнай савецкай улады з рэлігіяй. Верш Г. Пузыні застаецца на сёння адзіным пісьмовым помнікам, які ўвекавечвае памяць пра гэтую цудоўную святыню нашага краю.

Высновы

У XIX стагоддзі на хвалі рамантызму ўзрастае цікавасць да засваення і інтэрпрэтацыі на новым мастацкім узроўні біблійных матываў, сюжэтаў і вобразаў у польскамоўнай паэзіі Беларусі. Каштоўным узорам і прыкладам для перайманя тут стаў мастацкі вопыт Д.Г. Байрана ў паэтычным цыкле *Габрэйскія мелодыі*, які адразу ж натхніў на аналагічны творчы пошук паэтаў з іншых еўрапейскіх краін, дзе нараджаўся рамантызм, і тэрыторыя былой Рэчы Паспалітай, куды ўваходзілі землі Беларусі, не была выключэннем.

Найперш на біблійным грунце на хвалі рамантызму набываюць сакралізацыю патрыятычныя матывы: служэнне айчыне, любоў да яе, смутак з прычыны яе няволі, жаданне адрадзіць і вярнуць даўнія традыцыі, славу, страчаную дзяржаўнасць і, перадусім, свабоду. Такая сакралізацыя патрыятычных вобразаў і матываў назіраецца, напрыклад, у філамацкай творчасці Адама Міцкевіча (вершы *Песня*, *Песня філарэтаў*, *Ода да маладосці*), аб чым мы ўжо пісалі ў свой час (Bahdanowicz, 2016, s. 104–117). Бачым такую сакралізацыю і ў разгледжаным

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

у гэтым артыкуле вершы Т. Лады-Заблоцкага *Жаль Ераміі*, напісаным па матывах 136-га псалма і забароненым цэнзурай для друку.

Важныя працэсы абнаўлення адбываюцца ў XIX ст. і ў духоўнай паэзіі дыдактычна-выхаваўчага зместу, асаблівы прыклад якой знаходзім у зборніку Я. Чачота *Pieśni Ziemianina* (Wilno, 1846). Разнастайная вобразная палітра гэтых вершаў праектуецца на найважнейшыя маральна-этычныя аспекты хрысціянскага веравучэння, грунтуючыся пераважна на ідэях з Евангелляў і апостальскіх пасланняў. Выконваючы ролю спецыфічнай „займальнай катэхезы", вершы Я. Чачота духоўнай тэматыкі стваралі асновы паэтычнай хрысціянскай педагогікі і развівалі ідэю „свецкага апостальства".

Глыбокая хрысціянская духоўнасць была ўласцівая ў сярэдзіне XIX ст. творчасці і такіх выдатных польскамоўных паэтаў нашага краю, як Г. Пузыня і У. Сыракомля. У іх творчасці адбываецца адкрыццё новага ўзроўню духоўнага жыцця чалавека, іх лірычная рэфлексія, узносячыся ўсё яшчэ на рамантычнай хвалі, абвастрае „ўнутраны зрок", якім спасцігаюцца праўды жыцця і праўды веры, акрэсліваюцца каштоўнасныя арыенціры і духоўныя ідэалы. Біблійныя вобразы і пастулаты веры ўзбагачаюцца навізной алюзій і вобразных сродкаў, падлягаюць новай метафарызацыі, якую ўзбагачае досвед рэальнага жыцця. Такой „новай метафарай" у тым часе становяцца „званы для глухіх", „крыж у лесе" – пераасэнсаваныя біблійныя сімвалы, якія сведчаць пра пошук духоўнага шляху, які здзяйсняецца бесперапынна ў кожнай чалавечай душы, пастаўленай перад свабодай выбару вечных або часовых каштоўнасцяў.

Духоўнасць, як сведчыць наш аналіз, была важным чыннікам паэтычнай культуры XIX ст., і значэнне яе павялічвалася, бо наступаў час усё большай секулярызацыі ў свеце, умацавання лаіцкага падыходу да чалавека і яго зямных спраў, адсоўвання хрысціянства, як казачнага міфа, паноўнай тады матэрыялістычнай канцэпцыяй свету і філасофскімі дактрынамі, заснаванымі на тэзісе, што „Бог памёр". Ад гэтага быў адзін крок да абсалютнай афіцыйнай бязбожнасці, узведзенай бальшавікамі ў ранг дзяржаўнай палітыкі, і ваяўнічага атэізму, які руйнаваў святыні каменныя і святыні сэрцаў, выганяючы адтуль Бога. Тым не менш Бог не памёр, у адрозненне ад тых, якія Яго рознымі спосабамі „забівалі", бо сакральнае існуе незалежна ад волі і жадання людзей. Прыклады духоўнай паэзіі, разгледжаныя ў нашым артыкуле, сведчаць, што хрысціянская вера і духоўнасць, як той „крыж у лесе", стаіць і трымае неба над людскім жыццём.

Біблійныя матывы і вобразы шырока прадстаўлены таксама ў творчасці іншых прадстаўнікоў польскамоўнай паэзіі Беларусі XIX ст., што патрабуе свайго далейшага вывучэння і сістэматызацыі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Bibliografia

Źródła

Bajron, George, Gordon. (2012). *Promietej: Stichotworenija*. Pierewod s anglijskogo. Sankt-Pietierburg: Amfora; Moskwa: Komsomolskaja prawda. [Байрон, Джордж, Гордон. (2012). *Прометей: Стихотворения*. Перевод с английского. Санкт-Петербург: Амфора; Москва: Комсомольская правда].

[Byron, George, Gordon]. (1979). *Selections from Byron*. Moscow: Progress Publisher.

[Czeczot, Jan]. (1846). *Peśni ziemianina,* przez tłumacza *Piosnek wieśniaczych* znad Niemna i Dźwiny. Wilno: Drukiem Józefa Zawadzkiego.

Czaczot, Jan. (2014). Ścipłaść mierkawannia pra samoha siabie i inszyja wierszy. Pierakład z polskaj mowy I. Bahdanowicz. *Nasza wiera*, 3, s. 27–29. [Чачот, Ян. (2014). Сціпласць меркавання пра самога сябе і іншыя вершы. Пераклад з польскай мовы І. Багдановіч. *Наша вера*, 3, с. 27–29].

Łada-Zabłocki, Tadeusz. (1844). *Poezje* (rękopis). W: Lietuvos Mokslų Akademijos Vrublevskių Biblioteka, Vilnius, F 9-2148.

Łada-Zabłocki, Tadeusz. (1845). *Poezje*. Petersburg: W Drukarni Karola Kraja.

Łada-Zabłocki, Tadeusz. (1846). Żale Jeremiasza. Naśladowanie Psalma sto trzydziestego siódmego. *Rubon. Pismo zbiorowe, poświęcone pożytecznej rozrywce*, 7, s. 160–162.

[Mickiewicz, Adam]. (1822–1823). *Poezye Adama Mickiewicza*. T. 1. Wilno: Drukiem Józefa Zawadzkiego.

Psałtyr. (2016). Pierakład z starahreckaj a. A.Nadsana. Połack: Hreka-katalickaja parafija Swiatapakutnika Jazafata u h. Połacku. [*Псалтыр*. (2016). Пераклад з старагрэцкай а. А. Надсана. Полацк: Грэка-каталіцкая парафія Святапакутніка Язафата ў г. Полацку].

Puzynia, Gabryela. (2017). Kascioł u Białyniczach. Pierakład z polskaj mowy I. Bahdanovicz. *Nasza wiera*, 2, s. 44–45. [Пузыня, Габрыэля. (2017). *Касцёл у Бялынічах.* Пераклад з польскай мовы І. Багдановіч. *Наша вера*, 2, с. 44–45].

Puzynina, Gabryela. (1845). *Dalej w świat*. Wilno: Drukiem Józefa Zawadzkiego.

Skaryna, Francysk. (1990). *Twory: Pradmovy. Skazanni. Paslasłouji. Akafisty. Paskhalija.* Minsk: Navuka i tekhnika. [Скарына, Францыск. (1990). *Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія.* Мінск: Навука і тэхніка].

Syrokomla, Władysław. (1862). *Poezje ostatniej godziny*. Warszawa: Nakładem Gustawa Sennewalda.

Syrokomla, Władysław. (1974). *Poezje.* Wybrał i wstępem poprzedził Julian Rogoziński. Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy.

Żeligowski, Edward. (1859). [Nadesłano]. *Kuryer Wileński. Gazeta urzędowa*, 75.

Opracowania

Bahdanowicz, Iryna. (2014). Paetyczny katekhizis Jana Czaczota. *Nasza wiera*, 3, s. 24–26. [Багдановіч, Ірына. (2014). Паэтычны катэхізіс Яна Чачота. *Наша вера,* 3, с. 24–26].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/11/2026 17:48:39

Bahdanowicz, Iryna. (2016). *Załataja Horka: wierszy, pierakłady, artykuły*. Minsk: Knihazbor. [Багдановіч, Ірына. (2016). *Залатая Горка: вершы, пераклады, артыкулы*. Мінск: Кнігазбор].

Khaustowicz, Mikałaj. (2010). *Szlakami ku białoruskości. Szkice, artykuły, eseje*. Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego. [Хаўстовіч, Мікола. (2010). *Шляхамі да беларускасці: нарысы, артыкулы, эсэ*. Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego].

Marchel, Uładzimir. (1997). *Prysutnaść byłoha. Narysy, artykuły, ese*. Minsk: Wydawiec M.M. Trafimczuk. [Мархель, Уладзімір. (1997). *Прысутнасць былога: нарысы, артыкулы, эсэ*. Мінск: Выдавец М.М. Трафімчук].

Data nadesłania artykułu: 19.04.2018

UMCS